ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● ● NO.45 (3453) ● ● ЧАЦВЕР, 3 СНЕЖНЯ, 2015

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: WWW.GOLAS.BY



**Марыліна — Каралева!**

Добрая вестка з Аргенціны: там прадстаўніца Беларускага культурнага таварыства “Усход”, удзельніца маладзёжнага танцавальнага ансамбля “Чайка” Марыліна Дрозд прызнана Каралеваю беларускай дыяспары Стар. 2



**Лётчык-герой Дзмітрый Аскаленка**

Памяць пра ўраджэнца Быхаўскага раёна, Героя Савецкага Саюза ўшанавана ў Санкт-Пецярбурзе Стар. 3



**Саграваe душы прыгажосць**

Чым заняцца доўгімі зімовымі вечарамі? Стар. 4

СВЯТА

# Сцежкі, што дадому прывядуць

## Дні беларускай культуры ў Цюменьскай вобласці ўрачыста завяршыліся ў абласным Палацы нацыянальных культур “Будаўнік”



**Збірацца разам у Дні беларускай культуры — добрая традыцыя цюменьскіх супляменнікаў**

Цёплую, сімвалічную назву меў вялікі заключны канцэрт: “Сцяжынкамі продкаў”. Як вядома, Дні культуры ў нас традыцыйныя, праходзяць кожную восень і сёлета прысвячаліся 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Святкавалі яшчэ 10-гадовы юбілей вакальнага гурта “Жывіца”: ён створаны пры Доме культуры сяла Дзясятава Ішымскага раёна, а кіруюць ансамблем Сяргей і Алена Антончанкі.

Ад прадзедаў і дзядоў, з пакалення ў пакаленне творчасць ды збіраецца па крупінках моўнае, песеннае багацце — важныя складнікі духоўнай культуры беларусаў, што жывуць і ўдалечыні ад Бацькаўшчыны. Збіраюць, вывучаюць, услухоўваюцца ў глыбінныя, прыхаваныя сэнсы і сугуччы народных песень і энтузіясты з ансамбля “Жывіца”. Адметны гурт дае ім новае жыццё. Ягоны творчы почырк — гэта шчырасць, непасрэднасць, самабытнасць, высокае майстэрства. На гэты раз спевакі парадавалі гасцей вядомымі народнымі песнямі на беларускай ды рускай мовах. Прыгожа быў інсцэнаваны фрагмент старадаўняга славянскага абраду “Юр'я” — ён, як вядома, шырока бытаваў у Беларусі, сустракаецца і цяпер, а прысвячаецца важнай гаспадарчай падзеі: першаму веснавому выгану свойскай жывёлы ў поле.

На свяце было шмат паважаных гасцей. Гэта, у прыватнасці, Ганаровы консул Беларусі ў Цюмені, старшыня савета Цюменьскай абласной грамадскай арганізацыі “Саюз-інтэграцыя брацкіх народаў” Уладзімір Шугля, першы намеснік старшыні Цюменьскай Думы Андрэй Арцюхоў, дэпутаты Думы Сяргей Мядзведзеў і Герой Расіі Уладзімір Шарпатаў, дырэктар Палаца Людміла Лосева. Быў у зале і Сяргей Яфімчык — ён раней узначальваў праўленне Цюменьскай абласной грамадскай арганізацыі “Нацыянальна-культурнае таварыства “Аўтаномія Беларусь”, а цяпер выконвае абавязкі начальніка аддзела па справах нацыянальна-культурных аб'яднанняў і казацтва камітэта па справах нацыянальнасцяў вобласці. А праўленне нашай беларускай аўтаноміі цяпер узначальвае Марыя Піскун. → Стар. 2

ВЕСТКІ

## Моладзь стварае будучыню

Кацярына Аляксандрава

**Крэатыўныя студэнцкія праекты атрымліваюць дзяржаўную падтрымку**

Першы Рэспубліканскі форум моладзевага стартап-руху прайшоў у Пінску. Галоўнай мэтай падзеі, па словах міністра адукацыі Беларусі Міхаіла Жураўкова, было тое, каб маладосць, крэатыў, ініцыятыва і бізнес знайшлі адзін аднаго. “Мерапрыемства паказала: моладзь нестандартна мысліць і прапаноўвае разнастайныя, часам дзіўныя ідэі. А яшчэ — студэнты выдатна абараняюць бізнес-праекты, аргументавана даказваюць неабходнасць увасаблення іх у жыццё”, — адзначыў Міхаіл Жураўкоў.

Моладзь Беларусі ўключаецца ў эканамічнае жыццё краіны. І на форуме ў Пінску было каля 60 цікавых бізнес-праектаў, якія распрацавалі ды прэзентавалі студэнты з 16 ВНУ. А журы, у складзе якога былі прадстаўнікі бізнес-супольнасцяў, прадпрыемстваў і арганізацый, для падтрымкі выбрала лепшыя. Так, у намінацыі “Самы інавацыйны бізнес-праект” грант ад Мінадукацыі на рэалізацыю атрымала каманда БДТУ за распрацоўку праекта па вырабе паркета з тэрмамеханічнай мадыфікаванай драўніны. Самай камерцыйна перспектыўнай стала ідэя каманды БНТУ “Студэнцкае бюро праектавання крэатыўнай упакоўкі”. Грант быў уручаны і за крэатыўны падыход да вырашэння актуальнай праблемы камандзе БДЭУ — праект “Закон чысціні”. А студэнты БДУ з інавацыйнай распрацоўкай “Беларыцар” атрымалі сертыфікат ад Парку высокіх тэхналогій на яе далейшае ўдасканаленне.

РЭХА ПАДЗЕІ

# І конь, і трапяткая лань...

Іван Ждановіч

**Нататкі з нагоды мастацкай падзеі, рухавіком якой стаў здаровы камерцыйны разлік**

Вялікую ды працяглую выставу-продаж у мінскім Палацы мастацтва пад назвай “Восеньскі салон з Белгазпрамбанкам” без націскаж можна лічыць падзеяй. Арт-праект прысвячаўся творчасці малады беларускіх мастакоў — творы ў розных жанрах каля 90 з іх адабралі для выставы таямнічыя 9 беларускіх экспертаў. “А суддзі хто?”, — спрабавалі дапытацца журналісты на прэс-канферэнцыі ў арганізатараў, аднак безвынікова... Падводзячы вынікі арт-праекта, арганізатары паведамілі: выставу наведала больш за 10 000 чалавек, больш за 60 твораў (30 працэнтаў ад агульнай колькасці) прададзены за месяц экспазіцыі. Заахвочаны лаўрэаты ўпершыню заснаванай прэміі “Арт-Беларусь”, якіх вызначала вельмі аўтарытэтнае журы, у складзе якога — прызнаныя эксперты ў галіне сучаснага мастацтва сусветнага ўзроўню.

Такога ў Беларусі раней не было: каб творы мастацтва масава, прама з выставы, прадаваліся. Адзін малады мастак, чуў, дасціпна жартаваўкаламбурыў у кампаніі дзяўчат наконт сутнасці новага праекта: “Калі вось твой, Кацярына, твар напісаць як мастацкі твор, то партрэт будзе ўжо мець адразу тры іпастасі: твар, твор і тавар”... Зрэшты, што хаваць? Высокае мастацтва і цвярозы камерцыйны разлік любяць хадзіць побач. Паспяховыя мастакі — людзі, як правіла, нябедныя. А ўдалыя камерсанты любяць упрыгожваць сваё жыццё ў тым ліку і творамі мастацтва. Прыгажосць, талент і грошы цягнуцца адзін да аднаго... І хоць бываюць выключэнні, аднак дужы “конь” камерцыі — ніяк не антыпод “трапяткое лані” творчасці. Вось толькі ўпрэгчы іх у адну павозку — прыгожага і гарманічнага жыцця — бывае складана. → Стар. 4



**Васіль Пяшкун. Бабіна лета. 2013**

ДАЛЁКІ БЕРАГ

# Марыліна — Каралева!

## Добрая вестка з Аргенціны: там прадстаўніца Беларускага культурнага таварыства "Усход", удзельніца маладзёжнага танцавальнага ансамбля "Чайка" Марыліна Дрозд прызнана Каралеваю беларускай дыяспары

**Кацярына Мядзведская**

У глабальнай павуціне сціраюцца межы нават паміж кантынентамі. Лягчэй знаходзіць сяброў ды родных, якія жывуць у замежжы, быць у курсе іх спраў, дзяліцца навінамі. Знікаюць і моўныя бар'еры: цяпер пра тое, дзе знаходзіцца чалавек, як і з кім адпачывае, што пабачыў, даведваемся больш па фота, чым з пісьмаў, а пра настрой — па смайліках. Плюс online-перакладчыкі… Далёка ехаць ды і нятанна, скажам, трапіць з Мінска на Дзень імігранта — свята штогод праходзіць у горадзе Бярыса ў Аргенціне. А ў інтэрнэце — калі ласка! У фэйсбуку на старонках таварыства "Усход", ансамбля "Чайка", Пасольства Беларусі ў Аргенціне ды ў запісах асобных удзельнікаў з ліку супляменнікаў задоўга да падзеі аб'явілі: будзе конкурс прыгажунь, тэатралізавае прадстаўленне "Высадка іншаземцаў на бераг" у порце ў Бярысе. Праходзілі і шматлікія канцэрты, выступленні "Чайкі".

Івось—фотазшэсцяэтнадыяспар. На чале беларускай — сёлетняя каралева Марыліна Дрозд. А прозвішча ж якое беларускае! Пад фотаздымкамі розныя віншаванні. Ад сябе асабіста і ад калектыву рэдакцыі "Голасу Радзімы" павіншавала прыгажуню-пераможцу і я. Ды запыталася: хто з яе сям'і, чаму аказаўся ў Аргенціне? Ці адчувае сябе дзяўчына беларускай, чаму танцуе ў "Чайцы"?

У адказ Марыліна піша: "Добры дзень! (па-беларуску) Дзякуй за віншаванні! Для мяне вялікая радасць прадстаўляць сёлета беларускую супольнасць у Аргенціне, усіх нашчадкаў беларускіх перасяленцаў, а таксама сваю сям'ю. У Бярысу пераехалі мае прадзядуля і прабабуля — Платон Данілавіч Дрозд і Юлія Іванаўна (у дзявоцтве Дзенісеня) у 1936 годзе разам з трыма сынамі. Майму дзядулю Аляксандру было тады 8 год… Іх родная вёска Loktysze (Лактышы, Ганцавіцкі раён Брэстчыны. — **Аўт.**) была ў складзе Польшчы, ды й жылі родныя вельмі бедна. А ў Аргенціне ім абяцалі зямлю і дастаткак… Дзядуля ніколі не забываўся, што ён з Беларусі. Доўгі час быў сябрам клуба "Усход" (працуе з 1941 года). У тры гады і я ўпершыню прыйшла ў беларускую суполку ў Бярысе. Мне і цяпер падабаецца бываць у клубе, тут асаблівая атмасфера: утульнасці роднага дома. Наведваю заняткі па беларускай культуры, цікавыя мне абрады і звычаі беларусаў. З дзяцінства танцую ў ансамблі "Чайка". Часам нават сніцца, што я — у Беларусі, і вельмі хацелася б, каб гэты сон калі-небудзь стаў явай. А яшчэ ў мяне ёсць мара: вывучыць беларускую мову. І некалькі словаў я ўжо ведаю!"

Разам з пісьмом дзяўчына дасылала і фота: сама Марыліна ў нацыянальным строі, яна ж сярод сяброў з "Чайкі", у вобразе Каралевы беларускай дыяспары… А на чорна-белых здымках бачым яе родзічаў. Вось бабуля і дзядуля з малым хлопчыкам (ён стаў татам Марыліны), вось пасведчанне дзядулі, Аляксандра Дразда, што ён — член таварыства "Усход". І яшчэ метрыка дзядулі Аляксандра на польскай мове. Марыліна прасіла дасылаць ёй сённяшнія фота з Лактышоў і даведацца: можа там жыве нехта з родзічаў?



Марыліна Дрозд — беларуска з Аргенціны



Клубнае пасведчанне дзеда Аляксандра



Дзед, бабуля і тата Марыліны

З першай просьбай справіцца было лёгка: фотаздымкаў у інтэрнэце шмат. А Лактышы сёння даволі вялікая і, як гаворыцца, "жывая" вёска. Прыгожая, у абрамленні вады. Там і рэчка Лань, і вадасховішча Лактышы… Паспяхова працуе там рыбгас, створаны нават Музей рыбалоўства, з мясцовых славутасцяў — аднаўленая царква святога Мікалая Цудатворца са званіцай.

А што чуваць наконт радні? Паспрабуем пашукаць. Дарэчы, і ў старшыні Ганцавіцкага райсавета дэпутатаў таксама прозвішча Дрозд! Будзем спадзявацца, што аргенцінская Каралева адшукае сваіх родзічаў на Палессі, у Лактышах. Верыца: прыедзе яшчэ беларуская па духу Марыліны Дрозд з заакіянскай Аргенціны на зямлю продкаў. Вось калі, дарэчы, можна будзе сказаць: межы паміж краінамі сціраюцца не толькі ў віртуальнай прасторы. І сны Каралевы Марыліны стануць явaю…

ВЕСТКІ

# Пра сябе раскажуць самі

**Кацярына Немагай**

**Распачаўся чацвёрты этап конкурсу "Культура", які праводзіцца сярод грамадскіх суполак беларусаў замежжа на лепшыя культурныя праекты ў краінах пражывання**

Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур Беларусі і Таварыства па сувязях з суайчыннікамі за мяжой "Радзіма" пачалі прымаць заяўкі ад супляменнікаў з розных краін свету на ўдзел у конкурсе "Культура". Галоўная мэта яго, па словах дырэктара РЦНК Міхаіла Рыбакова, застаецца ранейшай: заахвоціць беларусаў замежжа актыўней займацца пашырэнем беларускай культуры ў свеце. "Аднак цяпер мы чакаем ад нашых сяброў, што будзе яшчэ і творчы аналіз таго, што яны робяць, — удакладняе Міхаіл Рыбакоў. — Хочацца, каб беларусы замежжа не проста праводзілі культурныя мерапрыемствы, але і паразважалі: што гэта ўрэшце дае, які розгалас будуць мець ды і ўжо маюць тыя падзеі, як шмат людзей даведаюцца пра беларускую культуру дзякуючы ім".

Нагадаем, конкурс "Культура" праводзіцца з 2012 года. Летась у ім паўдзельнічалі 18 беларускіх суполак — з Казахстана, Італіі, Эстоніі, Літвы, розных гарадоў Латвіі ды Расіі. Усім ім перадаем падарункі — нацыянальныя кашулі, ручнікі, прыгожыя лялькі, кампакт-дыскі, а таксама інфармацыйныя матэрыялы. Усе канкурсанты адзначаны дыпломамі, падзячнымі лістамі Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур і таварыства "Радзіма".

Заяўкі, справаздачы і новыя матэрыялы можна дасылаць як на электронныя скрыні арганізатараў — rcnk-1994@mail.ru, radzimabelarus@mail.ru, так і па звычайнай пошце: Дзяржаўная ўстанова "Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур", 220029, г. Мінск, вул. Чычэрына, 19, п. 105. Прымае матэрыялы і "Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за мяжой "Радзіма": г. Мінск, вул. Захарава, 23. Матэрыялы прымаюцца да 1 лютага 2016 года. Падрабязна пра ўмовы конкурсу можна прачытаць на старонцы РЦНК у фэйсбуку https://www.facebook.com/rcnk2015/.

СВЯТА

# Сцежкі, што дадому прывядуць



Удзельніцы святочнага канцэрта

**(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)**

Віншавалі гледачоў са святам беларускай культуры вядомыя ў Цюменьскай вобласці ды за яе межамі народны ансамбль песні "Лянок" (ім кіруе Клаўдзія Зуева), сямейны вакальны ансамбль "Спадчына" (кіраўніца Марыя Піскун), маладзевы ансамбль музыкі ды песні "Палессе" пад кіраўніцтвам Тамары Грыгор'евай. Паказалі сваё высокае майстэрства і народны фальклорны гурт "Россияночка" з сяла Ермакі (ім кіруе Надзея Вычужаніна) ды народны фальклорна-этнаграфічны гурт "Вячоркі" з Вікулава (на чале зноў яго стваральніца Валянціна Міхіенка). А якія прыгожыя беларускія танцы жывуць на зямлі Цюменьскай! Іх выконвалі харэаграфічны ансамбль "Верас", якім кіруе Алена Шарова, і дзіцячы харэаграфічны ансамбль "Акварэль" (кіраўнікі Надзея Цялежкіна і Наталля Носава)

Прыемна, што да беларускага руху, мастацкай творчасці ў Сібіры далучаюцца і новыя таленты. Вось і на канцэрце "Сцяжынкамі продкаў" вялікае замілаванне і захапленне ў гледачоў выклікаў яркі дэбют юных беларусаў — квартэт акардэаністаў, якім кіруе Алена Перыкава. Музыкі гралі мелодыі вядомых беларускіх песень.

На нашым свяце можна было не толькі атрымаць асалоду ад беларускага сцэнічнага мастацтва, але і прадэгуставаць стравы беларускай кухні. Працавала і выстава вырабаў майстроў народных промыслаў і рамёстваў "Палітра майстэрства".

Зноў згадваю, як хораша было слухаць родныя мелодыі ў выкананні юных акардэаністаў. Гэта ж так здорава, калі да культуры продкаў маюць цікавасць нашчадкі. І бачыцца мне такі вобраз: калі на дрэве адрастаюць новыя галінкі, распускаюцца новыя зялёныя лісточкі — значыць, дрэва жыве. Вось і дрэва беларускай культуры на Цюменьскай зямлі мае цяпер як моцныя карані, так і прыгожую зялёную крону.

Дарэчы, беларусаў у нашым рэгіёне, паводле статыстыкі, больш за 50 тысяч чалавек. Ёсць адкуль браца талентам!

На Дні беларускай культуры ў Цюмень прыязджала маці Святланы Рамнёвай з гурта "Лянок" з Жыткавіцкага раёна Гомельшчыны, яна таксама спявачка. Спадзяюся, пра тое яшчэ раскажа чытачам газета "Голас Радзімы".

**Вера Піскун**, г. Цюмень

**ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ**

# Лётчык-герой Дзмітрый Аскаленка

## Памяць пра ўраджэнца Быхаўскага раёна, Героя Савецкага Саюза ўшанавана ў Санкт-Пецярбурзе. Памятаюць пра суайчынніка і ў Беларусі.



**Лётчык Дзмітрый Аскаленка**

Восенню ў Санкт-Пецярбурзе прайшлі Дні Мінска, і будзе дарэчы расказаць пра героя, імя якога яднае гэтыя гарады. У Прыморскім раёне Санкт-Пецярбурга адна з вуліц носіць імя франтавога лётчыка-знішчальніка, Героя Савецкага Саюза Аляксандра Савушкіна. Едучы па ёй на грамадскім транспарце, і мне даводзіцца чуць: "Наступны прыпынак — вуліца Аскаленкі". Чыё ж гэта імя ўшанавана, чым чалавек заслужыў такі гонар? Заглянуў у інтэрнэт. Аказваецца, Дзмітрый Аскаленка — наш зямляк-беларус. Быў у гады вайны лётчыкам-знішчальнікам, ваяваў і загінуў на Ленінградскім фронце. За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў баях з нямецкімі захопнікамі, ганараваны ардэнамі Чырвонага Сцяга і Чырвонай Зоркі, званнем Героя Савецкага Саюза. А нарадзіўся герой 7 лістапада 1920 года ў вёсцы Следзюкі Быхаўскага раёна Магілёўшчыны. Вучыўся ў школе, закончыў тры курсы Мінскага палітэхнікума.



**Стэла ў гонар лётчыкаў-Герояў у Санкт-Пецярбурзе**

На тым грамадзянскае жыццё Дзмітрыя і завяршылася. З 1937 года ён — у Чырвонай арміі. У 39-м закончыў Ленінградскае ваеннае авіяцыйна-тэхнічнае вучылішча. Удзельнічаў у Савецка-фінскай вайне 1939-40 гадоў: быў авіятэхнікам. У 41-м, пасля заканчэння Качынскай ваеннай авіяшколы пілотаў, прыбыў у Ленінградскую ваенную акругу. Служыў у знішчальных авіяпалках, якія ўваходзілі ў 7-ы знішчальны авіякорпус СПА Ленінграда. Адным з першых асвоіў тэхніку пілатавання і тактыку начных палётаў. У паветраным баі атрымаў раненне.

Дзмітрый, як і я, родам з Беларусі, ды і вучыўся ў Мінскім палітэхнікуме, у якім пасля вайны, праз тры дзесяцігоддзі пасля яго, і я спасцігаў асновы спецыяльнасці оптыка-механіка. Імкненне больш даведацца пра супляменніка прывяло мяне ў 53-ю школу Прыморскага раёна. Раней славілася яна музеем, прысвечаным Дзмітрыю Аскаленку, аднак быў капрамонт, і музей зліквідавалі. Потым па ініцыятыве школьнага псіхолага Галіны Васільеўны Садоўскай (раней — старшая піянерважатая) ён адрадзіўся. Да справы далучыліся дырэктар школы Лізавета Аляксееўна Бадзенская, гісторык, і яе намесніца Алена Алегаўна Максімава. Кіруе музеем настаўніца гісторыі і грамадазнаўства Валянціна Арсенцьеўна Багданава, і ўжо напрыканцы 2006-га прайшлі ў аднаўленым музеі першыя экскурсіі.

У прызначаны час я ў школе, пазнаёміліся з загадчыцай музея. Валянціна Арсенцьеўна патлумачыла: хоць цяпер гэта "Музей Старой і Новой деревни", у ім ёсць раздзел, прысвечаны беларусу Дзмітрыю Аскаленку. На стэндах — фатаграфіі героя, яго сваякоў і аднавяскоўцаў, ветэранаў 26-га гвардзейскага знішчальнага палка, у якім ён праходзіў службу, копіі дакументаў. Ёсць рукапісная справаздача дэлегацыі піянераў пра паездку на радзіму лётчыка. Вось копія ўзнагароднага ліста ад 4 чэрвеня 1942 года: часова выконваючы абавязкі кампалка маёр Гарохаў і ваенны камісар Разніцкі хадайнічаюць аб прысваенні камандзіру звяна, старшаму лейтэнанту Дзмітрыю Аскаленку звання Героя Савецкага Саюза. Расказана пра баявыя справы афіцэра. За 11 месяцаў вайны ён здзейсніў 197 баявых вылетаў з агульным налётам каля 190 гадзін: прыкрываў войскі, штурмаваў перадавыя пазіцыі, артбатарэі, танкавыя і аўтакалоны праціўніка. 25 жніўня 41-га Дзмітрый удзельнічаў у налёце на нямецкі аэрадром, знішчана 48 бамбардзіроўшчыкаў. Адзін з самалётаў Аскаленка збіў на ўзлёце. Прыводзяцца іншыя эпізоды баявой дзейнасці лётчыка-знішчальніка: на той час на рахунку Дзмітрыя — 10 збітых самалётаў. Праз два дні ўзнагародны ліст лёг на стол камандзіра 7-га знішчальнага авіякорпуса палкоўніка Ярлыкіна. Штабісты надрукавалі тэкст на машынцы, і там — удакладненне: збітых самалётаў на рахунку беларуса ўжо 12.



**Фрагмент з узнагароднага дакумента**

Пакуль ліст ідзе "наверх", старлей Аскаленка ўжо — намеснік камандзіра авіяэскадрыллі ў званні капітана. Актыўна абараняе ленінградскае неба. І вось — 26 верасня 1942 года. Капітан выконваў баявое заданне. У раёне вёскі Манушкіна на яго самалёт напалі 9 знішчальнікаў і падбілі ў першыя хвіліны бою. Дзмітрый пакінуў палаючы самалёт на вышыні, недастаткова для раскрыцця парашута. Пра гібель пілота сведчыць запіс № 4 у спісе беззваротных страт 7-га авіякорпуса за перыяд з 20 верасня па 1 кастрычніка: "26.9.42 г. загінуў у паветраным баі". У музеі ёсць копія Указа Прэзідыума ВС СССР ад 14 лютага 1943 года аб прысваенні званняў Героя, там пад №9 значыцца прозвішча старшага лейтэнанта Аскаленкі, прычым без слова "пасмяротна". Пэўна, пра змены ў яго службовым становішчы і гібель ніхто ў Вярхоўны Савет СССР не паведамляў. За 15 месяцаў вайны капітан Аскаленка выканаў 230 баявых вылетаў, правёў 30 паветраных баёў, у якіх збіў 14 самалётаў суперніка асабіста і тры — у складзе групы. Пахаваны беларускі хлопец у брацкай магіле ў пасёлку Неўская Дуброўка Ленінградскай вобласці.

У музеі ёсць яшчэ адзін дакумент. У ім Валянціна Багданава арганічна злучыла ўрыўкі з франтавых лістоў Дзмітрыя Аскаленкі да дзяўчыны Ніны з тэкстам з узнагароднага ліста. Заслугоўвае ўвагі справаздача піянераў школы пра паездку на радзіму Дзмітрыя ў 1966 годзе. Там іх сустрэлі як родных не толькі бацькі Дзмітрыя, але і ўсе вяскоўцы, кіраўніцтва калгасу і раёна. Дарэчы, школьная піянерская дружына імя Дзмітрыя Аскаленкі некалькіх гадоў займала правы фланг у страі піянерый Ленінграда. Імя Героя-лётчыка было для школьнікаў важным стымулам, каб ва ўсім быць "на вышыні". І цяпер у 53-й школе прадаўжаюць добрыя традыцыі, прычым каля 25 працэнтаў настаўнікаў — выпускнікі школы. Гэта па хадайніцтве калектыву школы ў 1965-м імя Дзмітрыя Аскаленкі было прысвоена адной з бліжэйшых вуліц. Цяпер імем Героя названы вуліца ў Быхаве, плошчы ў пасёлку Неўская Дуброўка і ў вёсцы Следзюкі. На будынку школы ў Следзюках, дзе ён вучыўся, устаноўлена мемарыяльная дошка.

У Санкт-Пецярбурзе да сцяны дома № 4 па вуліцы Аскаленкі прымацавана мармуровая пліта са словамі: "Герой Савецкага Саюза Аскаленка Дзмітрый Яўхімавіч. 1920—1942. Слаўны абаронца ленінградскага неба. Загінуў у паветраным баі пад Неўскай Дуброўкай". У тым раёне на вуліцы Савушкіна паміж дамамі 64 і 66 усталяваная памятная стэла ў гонар Герояў Савецкага Саюза лётчыкаў-знішчальнікаў Дзмітрыя Аскаленкі, Пятра Пакрышава (двойчы Герой), Аляксандра Савушкіна. Пасля гібелі беларуса яго імя стала насіць эскадрылля 26-га гвардзейскага знішчальнага авіяпалка, у якой ён служыў. Пра тое сведчыць нататка, апублікаваная ў газеце "Красная звезда" ад 18 снежня 1942 года. За гады вайны званне Героя атрымалі 9 лётчыкаў з тае часці, у ёй служыў і савецкі касманаўт №2 Герман Цітоў. У паваенны час 26-ы авіяполк быў у складзе Ленінградскай ваеннай акругі, у 1986-м у поўным складзе перадыслакаваны ў раён Хабараўска. У далейшым часць атрымала новую тэхніку і памяняла найменне: стала авіяпалком знішчальнікаў-бамбавікоў.

Цяпер кіраўніцтва 53-й школы мае намер хадайнічаць аб прысваенні ёй імя Героя Савецкага Саюза Дзмітрыя Аскаленкі. Сёлета незадоўга да Дня Перамогі я накіраваў фатаграфію Героя і аповед пра яго ў Мінскі палітэхнічны каледж (праспект Незалежнасці, 85) — правапераемнік тэхнікума, у якім вучыўся Дзмітрый. Дарэчы, у 60-я гады, калі я быў яго навучэнцам, анічога не нагадвала там пра Героя. Не было мемарыяльнай дошкі ля ўваходу ў каледж і пяць гадоў таму, калі сустракаліся аднакашнікі нашай 239-й групы з нагоды 40-годдзя выпуску. І вось сувязь у нас з кіраўніцтвам каледжа адладжана. Спадзяюся, нам супольна ўдасца ўшанаваць памяць пра Героя і ў Мінску, наладзіць сяброўскія сувязі між Палітэхнічным каледжам Мінска і 53-й школай Санкт-Пецярбурга.

**Васіль Шалак,**
ветэран ваеннай службы,
выпускнік Мінскага
палітэхнікума 1967 года

---

**РАЗАМ**

## "І быў сэрцам ён чуллівы..."

**Рыгор Арэшка**

**Коласаўскі музей запрашае прыхільнікаў творчасці Песняра з розных краін паўдзельнічаць у Міжнародным дні чытання знакамітай паэмы "Сымон-музыка"**

Сама паэма, кажучы словамі Якуба Коласа, бярэ вытокі "Ад роднае зямлі, ад гоману бароў,/ Ад казак вечароў,/ Ад песень дудароў,/ Ад светлых вобразаў закінутых дзяцей,/ Ад шолаху начэй, / Ад тысячы ніцей,/ З якіх аснована і выткана жыццё/ І злучана быццё і небыццё..." Пясняр сваім творам абараняе ўсіх"белых варон" — людзей "не як усе", надзеленых талентам і не надта прыстасаваных да суровага, прагматычнага жыцця.

Сімвалічна, што 90-я ўгодкі паэмы адзначаюцца, калі ў Беларусі доўжыцца Год моладзі. "Беларускай моладзі сваю паэму прысвячаю. Аўтар" — чытаем перад творам. У гонар Якуба Коласа і юбілею паэмы 4 снежня Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа праводзіць акцыю "Міжнародны дзень чытання "Сымона-музыкі". "Паэма ўваходзіць у залаты фонд беларускай літаратуры і даўно жыве сваім жыццём, — гаворыцца ў прэс-рэлізе, дасланым у рэдакцыю. — Яе вывучаюць у школах, цытуюць, перавыдаюць з ілюстрацыямі знакамітых мастакоў. І сама паэма — крыніца натхнення для творцаў".



**У вобразе Сымона-музыкі**

Для ўдзелу ў акцыі трэба спампаваць на сайце музея паштоўкі з урыўкамі з паэмы на беларускай мове і ў перакладах з ілюстрацыямі Барыса Заборава і Мікалая Селешчука. Можна звярнуцца да арганізатараў: яны дашлюць тым, хто пажадае, электронны варыянт паэмы. Далей — выбіраем урывак, які найбольш нам кладзецца на душу. І 4 снежня чытаем выбраныя ўрыўкі ў кампаніі аднадумцаў, сяброў, калег або сам-насам. Супрацоўнікі музея прапануюць нам усім такім чынам зазірнуць у глыбіні сваёй душы. Трэці крок у акцыі: даслаць на электронную скрыню музея фота, зробленае ў час чытання. Можна — сэлфі на старонку MuzeyKolasa ў Instagram, ці відэасправаздачу. Усе тыя фота і відэа будуць на сайце музея і на старонках у сацсетках. А па выніках акцыі можна будзе спампаваць на сайце музея дыплом яе ўдзельніка.

Спадзяемся, да акцыі падключацца і беларускія суполкі замежжа. Як паведамілі ў Коласаўскім музеі, удзел у акцыі пацвердзілі ягоныя партнёры — музеі Расіі, Літвы і Украіны, а таксама Цэнтральная бібліятэка Валгаграда (Расія) і Таварыства беларускай культуры "Спадчына" (г. Друскінінкай, Літва).

РЭХА ПАДЗЕІ

# І конь, і трапяткая лань...

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

"Восеньскі салон з Белгазпрамбанкам" — якраз, пэўна, тая павозка! Знайшліся людзі, якія паспрабавалі ладзіць творчы (і дзелавы!) дыялог мастацтва з бізнесам. Не на голым, заўважым, месцы: і на лагатыпе салона вобразна люструюцца сімвалы-сілуэты Парыжа з надпісам "1903" ды Мінска з надпісам "2015". Дарэчы, і творы мастакоў-ураджэнцаў Беларусі, якія рэальна ўдзельнічалі ў Восеньскіх салонах у Парыжы на пачатку мінулага стагоддзя (Хаім Суцін, Міхаіл Кікоін, Марк Шагал, Дзмітрый Сцялецкі, Восіп Любіч, Паліна Хентава, Леан Індэнбаўм, Яўген Зак) таксама ў мінскім Палацы мастацтва былі з вялікай пашанай — і аховай — прадстаўлены. Тыя каштоўнасці-шэдэўры — з карпаратыўнай калекцыі Белгазпрамбанка. Акрамя яго, арганізатарамі арт-праекта выступілі Саюз беларусіх мастакоў, Рэспубліканская мастацкая галерэя (Палац мастацтва), Цэнтр візуальных ды выканальніцкіх мастацтваў "АРТ карпарэйшн", праект падтрымалі Мінкультуры Беларусі ды Пасольства Францыі ў Беларусі.

Разнастайныя жанры, раскаванае, часам парадаксальнае і яўна эпатажнае мастацкае мысленне… У жаданні вытварыць "нешта такое" маладыя творцы, падаецца мне, часам губляюць мэту: дзеля чаго? Калі ў імя жыцця, прыгажосці, радасці — то ўсё да месца. А калі — цёмна і безвыходна, і здрадкае пачуццё меры, то — "навошта такая дарога, што не вядзе да Храма?". Зрэшты, не бяруся быць суддзёй, проста, ходзячы па выставе, часам лавіў сябе на думцы: эх, ну навошта ж сваю маладосць і талент прыдушваць магільнай плітою змрочных, інфернальных вобразаў… Што ж, будзем успрымаць выставу-продаж як цікавы эксперымент. Урэшце, як жартуюць аптымісты, з любога свінства можна выразаць кавалачак вяндліны… Цікава, што на заканчэнне салона экспертнае журы, вызначыўшы пераможцаў, пакінула і пасланне, выказала "глыбокае прызнанне ўсім мастакам, прадстаўленым на выставе" ды назвала спаборніцтва: "эксперымент у дэмакратыі". Журы палічыла, што такое спаборніцтва "заклікана ўзгадоўваць далікатную эканоміку мастацтва, і ўдзел у ім намнога больш значны за перамогу".

Пакідаючы выставу, я прагаласаваў. прызнаюся, за вельмі цікавыя, нават містычна-культавыя творы, якія мне спадабаліся — мастака Сяргея Ашухі. Гэта аўтарскія лялькі, узятыя ў рамкі — нібы карціны. І столькі мне пабачылася там і фантазіі, і глыбіні думкі. І шмат светлых асацыяцый вакол твораў круціцца… А якая тонкая, філіграная праца, прычым у розных тэхніках. І да таго ж, як мне падаецца, студэнт Акадэміі мастацтваў добра разумее: ягоныя лялькі — то не шырпатрэб для аматараў. Яны маюць і высакародства — адна лялька ж і названа: "Царская", і годную цану. Як і, скажам, тыя дагледжаныя, выкшталцоныя коні знакамітай ахалтэкінскай пароды са знакамітых канюшань Туркменістана. З аднаго боку, у лялечным такім творы ўладарыць трапяткая лань натхнення, з другога — і працавіты "конь таленту" вывозіць яе (бо колькі ж працы трэба, каб задуманы твор нарадзіўся) у свет высокай камерцыі… Цікава, што па выніках інтэрнэт-галасавання на сайце праекта, і пра тое паведамілі арганізатары, пераможцам конкурсу стаў менавіта Сяргей Ашуха з творам «Аўтарская лялька "Сон Месяца"». Вызначаны таксама іншыя мастакі-пераможцы ў розных намінацыях, у розных жанрах.

Што ж, няхай рухаецца і далей гэтая прыгожая, яркая, жыццядольная фурманка, у якую запрэжаны натхненне і разлік! Спадзяемся, з часам і беларускія мастакі з замежжа таксама змогуць паўдзельнічаць у гэтым цікавым праекце.





ІВАН ЖДАНОВІЧ



ВЕСТКІ

## Бас паказвае клас

Іван Іванаў

**Спявак Вялікага тэатра Беларусі Анатоль Сіўко заваяваў першую прэмію на міжнародным конкурсе "Новыя галасы" ў Германіі**

Пра таленавітага спевака наша газета пісала яшчэ калі ён, студэнт беларускай Акадэміі музыкі, стаў лаўрэатам Спецфонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі: "Дарога да прызнання", 4.06.2009. Тады, дарэчы, інтэрв'ю ў яго мы ўзялі па тэлефоне: ён адведваў бацькоў у Смаргонскім раёне. Супляменнікі з Таліна яшчэ падзяліліся з намі навіною: Анатоль перамагаў на конкурсе ў эстонскім горадзе Кохтла-Ярве і потым не раз спяваў на талінскай сцэне. І пра тое газета пісала. Цяпер ён — саліст Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі, заняты ў спектаклях, асвойвае новы рэпертуар і ўдзельнічае ў розных конкурсах. Нядаўна з тэатра ад нашай калегі Алены Балабановіч прыйшла навіна: Анатоль Сіўко атрымаў першую прэмію на міжнародным конкурсе "Новыя галасы".

"У Тэатры Гютэрсло (Германія) прайшоў фінал міжнароднага конкурсу, — удакладняе Алена. — Беларускі артыст выканаў арыю Радольфа з оперы Вінчэнца Беліні "Самнамбула" і літаральна пакарыў усіх членаў журы". Нагадаем, што "Новыя галасы" — гэта адзін з найпрэстыжных музычных конкурсаў у свеце. Сёлета ў ім удзельнічалі 42 вакалісты з 26 краін. А першую прэмію (15 000 еўра) атрымалі двое: беларус Анатоль Сіўко ды француженка Эльза Драйзіг. Яны прызнаны лепшымі сярод 11-і фіналістаў.

РОДНЫЯ ЛЮДЗІ

# Саграваае душы прыгажосць

**Чым заняцца доўгімі зімовымі вечарамі? Падказку можа даць рукадзельніца з Даўгаўпілса Валянціна Абушкевіч.**

Яшчэ на пачатку года ў Даўгаўпілскім Цэнтры беларускай культуры ладзілася творчая вечарына таленавітай нашай супляменніцы Валянціны Абушкевіч. Яна — добрая доктарка і рукадзельніца, тонкі знаўца паэзіі ды музыкі, актывістка беларускай суполкі "Уздым". Летась у лістападзе мы віншавалі яе з 80-годдзем. А якая ў зямлячкі яснасць думкі і памяць! Нарадзілася яна і вучылася ў Беларусі, потым пераехала ў Даўгаўпілс, дзе шмат гадоў працавала ў медыцыне: тэрапеўтам, потым загадчыцай палiклiнiкi, дэрматавенеролагам. Яе малодшы сын — лекар жывёл. У Беларусі жывуць родныя людзі Валянціна Пятроўны: у Віцебску, напрыклад, старэйшы сын-артыст с сям'ёй. На вечарыне гучалі вершы, працавала выстава вязаных сурвэтак і вышыўкі, быў модны паказ-дэфіле, спевы, гумар… Розныя віды і формы прыгажосці суладна існавалі, так што ўся творчая вечарына Валянціна Пятроўны пакінула па сабе пачуцці радасці, захаплення.



Выставы і паказы яе вырабаў у Беларускім доме праходзілі ўжо не раз. Раней мы любаваліся вязанымі кручком рэчамі: гэта каўнерыкі ды пончa. Кожны раз майстрыха прапануе новыя свае працы, прычым да дробязяў прадумвае, як іх лепей паказаць. На апошняй вечарыне, помніца, юбілярка натхнёна чытала вершы любімых паэтаў пра каханне. "Мы ж і аўтараў нават не запомнілі ўсіх: столькі вершаў — і ўсе на памяць!" — былі ў захапленні гледачы. А яна і ў вершах сваіх выказала, чаму захапляецца вязаннем: "То крючок в руках, то спица./ С детства стала кружевницей./ Петли, годы всё низала,/ Коль моглось, всегда вязала…". Гледачы апладзіравалі, калі мадэлі дэманстравалі кофтачкі, палярыны, пончa і каўнерыкі — плён працы майстрыхі. Дарэчы, пад кожную кофтачку (а іх амаль 50!) яна сама падабрала фон-мелодыі. А мадэлямі выступалі Дзіяна Шылейнэ-Шылейка, Марытэ Іванова ды Ілона Раманоўская.



Валянціна Абушкевіч — таленавітая і працавітая рукадзельніца

Музычныя падарункі таленавітай землячцы прысвяцілі гурт "Пралеска", дуэт "Алёна ды Ганна", скрыпачка Анастасія Малышава, а музычны фон паказу забяспечыў канцэртмайстар Вячаслаў Пятроў. Беларуская, руская, латгальская ды яўрэйская матывы гучалі ва ўнісон разнастайнасці талентаў спадарыні Валянціны і шматэтнічнасці Даўгаўпілса. Станіслаў Валодзька і Анастасія Сазанкова чыталі свае вершы, а Галіна Сантоцкая — малітву ў вершах. Шмат добрых слоў сказалі іншыя актывісты "Уздыма" — Вольга Паўлавіч і Людміла Сінякова, Зінаіда і Айвар Сіліні, Яўгенія Гуляева і Алена Боўт, а таксама калегі-медыкі, сябры і госці. Потым была і фотасесія на фоне экспазіцый.

У нашай Валянціны Пятроўны прыгожая і шчодрая, сапраўды беларуская душа. Печ у Беларускай хатцы ўпрыгожвае яе вышыўка "Чаяванне", і пакрывала-дыван майстрыха падарыла Беларускаму дому. І ў згаданым вышэй яе вершы ёсць радкі: "Вот от этого удела/ Я рукой себя одела./ Много близким подарила,/ А в мечтах всегда творила".

**Жанна Раманоўская,**
кіраўніца Цэнтра беларускай культуры г. Даўгаўпілс

**Заснавальнік:** Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск
**Рэдактар** Віктар Міхайлавіч Харкоў
**Адрас рэдакцыі:** пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005
**Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61.** Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
**Бюро па рэкламе:** Тэл. +375 17 290 60 11
**Тэлефон рэдакцыі:** +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31
**E–mail:** golas_radzimy@tut.by
**Аб'ём выдання:** 1 друк. арк.
**Тыраж:** 1930, **Заказ:** 1794
**Час падпісання ў друк:** 20.10
Выходзіць 1 раз на тыдзень
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.
© "Голас Радзімы", 2015